# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

5 снежня 2002 года, чацвер, № 16 (1864)

ПАДЗЕІ

## Герб БДУ на фасадзе галоўнага корпуса



*Урачыстая ўстаноўка герба БДУ на фасадзе галоўнага корпуса адбылася 29 лістапада.*

Амаль два гады ішла праца па стварэнні сімвала, які ўвасабляе сутнасць і прызначэнне універсітэта. 17 мая 2000 г. камісія па распрацоўцы геральдычнай сімволікі БДУ прапанавала цяперашні варыянт — ліст папараці на фоне свячэння яе таямнічай кветкі. 25 мая таго ж года Аб'яднаным саветам універсітэта ён быў зацверджаны і стаў асноўным элементам распрацаваных пазней герба, сцяга, штандарта, а таксама разнастайнай сімволікі БДУ.

*Мікалай ГРАДЗЮШКА, студэнт II курса факультэта журналістыкі*

*Фота аўтара*



СЕМІНАРЫ

## Нямецка-беларускія інавацыі

*Напрыканцы лістапада ў нашым універсітэце прайшоў беларуска-нямецкісемінар "Актуальныя пытанні сумеснай навукова-інавацыйнай дзейнасці".*

Прыняць удзел у працы семінара былі запрошаныя старшыня Камітэта па навуцы і тэхналогіях пры Савеце міністраў Рэспублікі Беларусь, прафесар А.М. Русецкі, першы намеснік міністра адукацыі Беларусі А.І. Жук, віцэ-прэзідэнт НАН Беларусі Ю.М. Плескачэўскі, прадстаўнік Федэральнага міністэрства адукацыі і даследаванняў ФРГ Матыяс Нагель, прадстаўнік Федэральнага міністэрства эканомікі і працы ФРГ Кэтрын Мэер і інш. На мерапрыемстве былі таксама прадстаўлены такія ўстановы і арганізацыі, як БДУ, "Белінфонд", Кансультацыйны цэнтр міжнароднага навуковага супрацоўніцтва ў Беларусі, Нацыянальны цэнтр трансферу тэхналогій, Рэспубліканская навукова-тэхнічная бібліятэка, НП РУП "Металіт" БНТУ, ЗАТ "Тэхналагічны парк Магілёў", Даследчы цэнтр у Юліху, TECHNOSTART GmbH, Прадстаўніцтва нямецкай эканомікі Нямецкага Савета гандлёва-прамысловых палат у Рэспубліцы Беларусь і інш.



АБ'ЯВЫ

### Факультэт кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ

*аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:*

ДАЦЭНТА КАФЕДРЫ дзяржаўнага права (1);
СТАРШАГА ВЫКЛАДЧЫКА КАФЕДРЫ: дзяржаўнага права (1), гуманітарных дысцыплін (1).

Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.

*Адрас: 220037, г. Мінск, вул. Батанічная, 15, факультэт кіравання і сацыяльных тэхналогій, аддзел кадраў, тэл. 210-01-10.*

МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

## Кнігі з Кітая

Урачыстая перадача літаратуры і тэхнічных сродкаў нашаму універсітэту ад пасла Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Беларусі Юй Чжэнцы адбылася 26 лістапада на філалагічным факультэце. Перададзеныя кнігі і апаратура дапамогуць беларускім студэнтам больш глыбока вывучаць Кітай.

Кітайскае аддзяленне на філфаку, дзе вывучаюць кітайскую мову, літаратуру і культуру, было адкрыта ў 2001 г. Сёння студэнты гэтага аддзялення маюць магчымасць займацца па дасканалых навучальных праграмах пад кіраўніцтвам высокакваліфікаваных выкладчыкаў з КНР, а таксама працягваць навучанне ва універсітэтах Кітая.

*Па інфармацыі прэс-службы БДУ*

КАНФЕРЭНЦЫІ

## Па слядах Напалеона

*Міжнародная канферэнцыя "Французска-руская вайна 1812 года: еўрапейскія дыскурсы і беларускі погляд" адбылася 29 лістапада на гістарычным факультэце.*

Арганізатарамі канферэнцыі сталі наш універсітэт і Цэнтр напалеонаўскіх даследаванняў (Францыя). У працы навуковага мерапрыемства прынялі ўдзел спецыялісты з Беларусі, Францыі, Расіі, Украіны, Польшчы.

Падчас працы канферэнцыі адбыліся выстава і прэзентацыя новых кніг, прысвечаных тэматыцы канферэнцыі, фотамайстэрня "Гісторыя і гісторыкі", а таксама "Французскія сустрэчы", арганізаваныя французскімі гісторыкамі.

Апрача таго, 30 лістапада ўдзельнікі канферэнцыі выехалі на Бярэзіну і наведалі памятныя гістарычныя мясціны.

*Па інфармацыі прэс-службы БДУ*

ВІНШУЕМ!

# У філолагаў новы дэкан





У апошнюю пятніцу лістапада калектыў дэканаў факультэтаў БДУ стаў на 100 % мужчынскім. Паглядзець на тое, як гэта адбывалася, можна было 29 лістапада ў актавай зале філалагічнага факультэта. Увечары тут праходзіла развітанне з былым дэканам — Ларысай Аляксандраўнай Мурынай і інаўгурацыя новага — Івана Сямёнавіча Роўды.

З урачыстымі словамі падзякі рэктар БДУ абвясціў, што своеасаблівым падарункам для былога дэкана будзе грашовая прэмія ў памеры двух мільёнаў рублёў. Ларыса Аляксандраўна паабяцала, што палову гэтай сумы аддасць на патрэбы студэнтаў універсітэта. Падарункам ад калектыву дэканаў стала модная "штучка" — мабільны тэлефон з занесенымі ў памяць нумарамі ўсіх дэканаў БДУ.



Дарэчы, Ларыса Аляксандраўна не пакідае філфак, а застаецца на пасадзе загадчыцы кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры.

Напэўна, самым запамінальным момантам свята стала віншаванне новага дэкана студэнтамі на ўсіх мовах, якія вывучаюць на філфаку — у тым ліку на кітайскай і хіндзі.

*Мікалай ГРАДЗЮШКА,*
*студэнт II курса*
*факультэта журналістыкі*

*Фота аўтара*

АКЦЫІ

# «Моладзь супраць СНІДу»

СНІД не выбірае сваімі ахвярамі краіну ці рэгіён — гэта небяспека для ўсіх. Сёння медыцына не мае ні лекаў, ані вакцыны супраць СНІДу. Адзіная мера абароны — прафілактыка.

Яшчэ не так даўно мы лёгка адганялі ад сябе змрочныя думкі: СНІД — гэта далёка, гэта рэдкасць, гэта не ў нас... Сёння мы ведаем, што СНІД побач, але гэтак жа стараемся не думаць пра яго, спадзяемся, што нас гэта не закране. Аднак штогод колькасць інфіцыраваных расце.

СНІД нельга спыніць, нельга ліквідаваць і пакуль што немагчыма вылечыць. Даводзіцца вучыцца жыць разам з гэтай праблемай і супрацьстаяць ёй. Для гэтага неабходна мець праўдзівую інфармацыю пра захворванне.

А што ведаюць пра яго студэнты БДУ, можна было пачуць 28 лістапада ў сталовай № 5, дзе адбывалася акцыя "Моладзь супраць СНІДу". Было шмат конкурсаў, з якімі ўдзельнікі спраўляліся надзвычай хутка. Вось вы змаглі б за пару хвілінаў прыдумаць рэкламу "АнтыСНІД", выкарыстоўваючы ў якасці дапаможных сродкаў прэзерватывы, нажніцы, скотч і маркер? А адкрыць пачак і дастаць прэзерватыў у баксёрскіх пальчатках? Як высветлілася, не толькі гэта, але і многае іншае могуць жыхары студгарадка. Асабліва, калі ў якасці падарунка ўдзельнікам выдаюць прызы: ад гандлёвага дома "Імперыя" — "Фішкі да піва" (дарэчы, паласавацца гэтымі смачнымі сухарыкамі змаглі бадай усе ахвотныя), ад Рэспубліканскага цэнтра прафілактыкі СНІД — прэзерватывы, а ад Апякунскага савета студгарадка БДУ — цудоўныя сувеніры.

*Юлія ЛАЗАР,*
*Кацярына ЛОБАЧ*



ПАДПІСКА – 2003

# "Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта"

*Пачалася падпіска на перыядычныя выданні на першае паўгоддзе 2003 года. Падпісная цана на часопіс "Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта" па серыях наступная:*

**Серыя I** (індэкс 74851) — фізіка, матэматыка, інфарматыка (№ 1, студзень; № 2, май):
індывідуальная — 5397 р.;
ведамасная — 11821 р.

**Серыя II** (індэкс 74852) — хімія, біялогія, геаграфія (№ 1, люты; № 2, чэрвень):
індывідуальная — 5397 р.;
ведамасная — 11821 р.

**Серыя III** (індэкс 74853) — гісторыя, філасофія, псіхалогія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, права (№ 1, сакавік):
індывідуальная — 2698 р.;
ведамасная — 5911 р.

**Серыя IV** (індэкс 74854) — філалогія, журналістыка, педагогіка (№ 1, красавік):
індывідуальная — 2698 р.;
ведамасная — 5911 р.

Падпісацца на часопіс "Веснік БДУ" можна ва ўсіх аддзяленнях сувязі Рэспублікі Беларусь.

*Рэдакцыя*
*і рэдкалегіі часопіса*

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

# Свята журфака



*Факультэту журналістыкі 21 лістапада споўнілася 58 гадоў. Хоць і не круглая дата, але ўсё ж нагода для прыемных урачыстасцяў.*

Святочныя падзеі пачаліся а дзесятай гадзіне ў актавай зале факультэта. На мерапрыемстве прысутнічалі прадстаўнікі рэдакцый газет, радыё, прэс-цэнтра МУС, а таксама студэнты розных курсаў. Кіраваў пасяджэннем, вядома, дэкан В.В. Вараб'ёў.

Госці распавядалі студэнтам пра спецыфіку працы ў розных СМІ, запрашалі студэнтаў у свае выданні. Напрыканцы першай часткі свята сем найлепшых студэнтаў старэйшых курсаў атрымалі граматы і кнігі з рук дэкана, а таксама грашовыя прэміі.

Аб адзінаццатай гадзіне распачалі сваю працу круглыя сталы па 6 кірунках. Галоўнай тэмай сталі праблемы і асаблівасці вытворчай практыкі ў СМІ, якую праходзіў кожны студэнт журфака (акрамя першакурснікаў). Найлепшыя студэнты-другакурснікі на пачатку канферэнцыі былі адзначаны граматамі і падарункамі за плённую працу падчас практыкі. Потым слова ўзялі рэдактары газет "Знамя юности", "Переходный возраст", "Чырвоная змена" (дадатку да газеты "Звязда"), а таксама разнастайных раённых газет. Выступілі з дакладамі і студэнты.

У другой палове дня першакурснікі наладзілі святочную праграму. Словам, свята ўдалося.

*Сяргей ДУБОВІК,*
*Дзяніс ТРАФІМЫЧАЎ,*
*студэнты II курса факультэта журналістыкі*

*Фотаздымак Сяргея ДУБОВІКА*

**У ПРАФКАМЕ СУПРАЦОЎНІКАЎ**

# Рэкамендацыі аб статусе выкладчыцкіх кадраў вышэйшых навучальных устаноў

**Прынятыя на XXIX сесіі ЮНЕСКА 21 кастрычніка – 12 лістапада 1997 г.**

*Якімі павінны быць умовы працы выкладчыкаў? Рэкамендацыі ЮНЕСКА, якія ў рэдакцыю перадаў прафсаюз супрацоўнікаў БДУ, даюць на гэтае пытанне поўны адказ. Магчыма, азнаёміўшыся з імі, вы яшчэ раз задумаецеся не толькі наконт сваіх абавязкаў, але і наконт правоў.*

## Рэзалюцыя

**Генеральнай канферэнцыі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры "Аб рэкамендацыях аб статусе выкладчыцкіх кадраў вышэйшых навучальных устаноў"**

Генеральная канферэнцыя, разгледзеўшы дакумент 29 c/12, які змяшчае праект Рэкамендацый аб статусе выкладчыцкіх кадраў вышэйшых навучальных устаноў

**зацвярджае**

ў адпаведнасці з артыкуламі 11 і 12 "Правілаў працэдуры, датычных рэкамендацый дзяржавам-членам і міжнародных канвенцый, якія трапляюць пад умовы пункта 4 артыкула IV Статута" вышэйпамянёную Рэкамендацыю, тэкст якой дадаецца.

### ПРЭАМБУЛА

Генеральная канферэнцыя Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА), якая збіралася ў Парыжы з 21 кастрычніка па 12 лістапада 1997 г. на сваю 29-ю сесію,

*усведамляючы* адказнасць дзяржаваў за забеспячэнне адукацыі для ўсіх, згодна з артыкулам 26 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека (1948 г.),

*нагадваючы*, у прыватнасці, аб адказнасці дзяржаваў за забеспячэнне вышэйшай адукацыі дзеля выканання пункта 1(c) артыкула 13 Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах (1966 г.),

*усведамляючы*, што вышэйшая адукацыя і даследчыцкая дзейнасць адыгрываюць вядучую ролю ў пошуку, паглыбленні і перадачы ведаў і ўяўляюць надзвычай каштоўны культурны і навуковы набытак,

*усведамляючы таксама*, што ўрады і буйныя сацыяльныя групы, такія як студэнты, прадпрымальнікі і працоўныя, жыццёва зацікаўленыя ў развіцці сістэмы вышэйшай адукацыі,

*прызнаючы* вырашальную ролю выкладчыцкіх кадраў вышэйшых навучальных устаноў ва ўдасканаленні вышэйшай адукацыі і важнае значэнне іх унёску ў развіццё чалавецтва і сучаснага грамадства,

*будучы перакананa*, што выкладчыцкім кадрам вышэйшых навучальных устаноў гэтаксама, як і ўсім іншым грамадзянам, варта прыкладаць усе намаганні для таго, каб спрыяць захаванню ў грамадстве культурных, эканамічных, сацыяльных, грамадзянскіх і палітычных правоў усіх народаў,

*усведамляючы* неабходнасць абнаўлення вышэйшай адукацыі ва ўмовах сацыяльных і эканамічных зменаў і ўдзелу ў гэтым працэсе выкладчыцкіх кадраў вышэйшых навучальных устаноў,

*Выказваючы* ўстурбаванасць слабасцю акадэмічнай супольнасці ва ўмовах палітычнага і эканамічнага ціску, які можа падарваць акадэмічную свабоду,

*беручы пад увагу*, што права на адукацыю, выкладанне і даследчыцкую дзейнасць можа быць рэалізавана ў поўным аб'ёме толькі ва ўмовах акадэмічнай свабоды і аўтаноміі вышэйшых навучальных устаноў і што адкрытае распаўсюджванне вынікаў, гіпотэз і думак ляжыць у аснове вышэйшай адукацыі і забяспечвае самую надзейную гарантыю дакладнасці і аб'ектыўнасці навуковай працы і даследчыцкай дзейнасці,

*імкнучыся забяспечыць* выкладчыцкім кадрам вышэйшых навучальных устаноў статус, адпаведны іх ролі,

*прызнаючы* шматстайнасць культур у свеце,

*беручы пад увагу* вялікую разнастайнасць законаў, рэгламентуючых нормаў, практыкі і традыцый, якія ў розных краінах вызначаюць структуру і арганізацыю вышэйшай адукацыі,

*улічваючы* разнастайнасць прававога становішча выкладчыцкіх кадраў вышэйшых навучальных устаноў у розных краінах, у прыватнасці ў залежнасці ад таго, ці распаўсюджваецца на іх дзеянне палажэнняў, датычных дзяржаўнай службы,

*будучы перакананай*, тым не меней, што ва ўсіх краінах узнікаюць падобныя пытанні, датычныя статусу выкладчыцкіх кадраў вышэйшых навучальных устаноў, і што гэтыя пытанні патрабуюць распрацоўкі агульных падыходаў і, па магчымасці, прымянення агульных нормаў, якія павінны быць вызначаны ў гэтай Рэкамендацыі,

*улічваючы* такія нарматыўныя акты, як Канвенцыя ЮНЕСКА аб барацьбе з дыскрымінацыяй у галіне адукацыі (1960 г.), у якой прызнаецца, што ЮНЕСКА павінна не толькі выступаць супраць усялякай дыскрымінацыі ў галіне адукацыі, але і спрыяць усеагульнай роўнасці магчымасцяў і роўнага да ўсіх стаўлення ў гэтай галіне на ўсіх узроўнях, уключаючы ўмовы атрымання адукацыі, а таксама Рэкамендацыя аб становішчы настаўнікаў (1966 г.), Рэкамендацыя ЮНЕСКА аб статусе навукова-даследчых работнікаў (1974 г.) і нарматыўныя акты Міжнароднай арганізацыі працы, датычныя свабоды асацыяцый, права на стварэнне арганізацый і права на заключэнне калектыўных дагавораў, а таксама на роўнасць магчымасцяў і роўнае стаўленне,

*імкнучыся* дапоўніць існыя канвенцыі, пакты і рэкамендацыі, якія змяшчаюцца ў пераліку міжнародных нарматыўных актаў, прыведзеных у Дадатку, палажэннямі, датычнымі праблем, якія ў першую чаргу закранаюць вышэйшыя навучальныя ўстановы, а таксама іх выкладчыцкія і навукова-даследчыя кадры,

*прымае* 11 лістапада 1997 года гэтую Рэкамендацыю.

### I. ВЫЗНАЧЭННІ

1. Для мэтаў гэтай Рэкамендацыі:

(a) пад "вышэйшай адукацыяй" маюцца на ўвазе праграмы навучання, падрыхтоўкі ці падрыхтоўкі для даследчыцкай дзейнасці на ступені паслясярэдняй адукацыі, якія забяспечваюцца універсітэтамі ці іншымі навучальнымі ўстановамі, зацверджанымі ў якасці вышэйшых навучальных устаноў кампетэнтнымі дзяржаўнымі органамі і/ці праз прызнаныя акрэдытацыйныя сістэмы;

(b) пад "даследчыцкай дзейнасцю" ў кантэксце вышэйшай адукацыі маюцца на ўвазе арыгінальныя даследаванні ў галіне тэхналогіі, прыродазнаўчых, інжынерных, сацыяльных і гуманітарных навук, медыцыны, культуры ці адукацыі, якія прадугледжваюць старанна арганізаваныя пошукі на аснове крытычнага падыходу з выкарыстаннем розных метадаў і прыёмаў, у адпаведнасці з характарам і ўмовамі пастаўленых праблем, якія накіраваны на ўдакладненне і/ці вырашэнне гэтых праблем і абапіраюцца на адпаведную інфраструктуру, калі ажыццяўляюцца ў інстытуцыйных рамках;

(c) пад "навуковай дзейнасцю" маецца на ўвазе працэсы, пры дапамозе якіх выкладчыцкія кадры вышэйшых навучальных устаноў пастаянна абнаўляюць веды па сваім прадмеце або рыхтуюць навуковыя публікацыі, распаўсюджваюць свае працы, удасканальваюць свае педагагічныя навыкі і ў якасці выкладчыкаў сваіх дысцыплін павышаюць сваю навуковую кваліфікацыю;

(d) пад "кансультацыйна-лектарскай працай" маецца на ўвазе прадастаўленне паслуг, дзякуючы якім рэсурсы той ці іншай навучальнай установы могуць выкарыстоўвацца па-за яе межамі для абслугоўвання самага разнастайнага кантынгенту ў дзяржаве ці рэгіёне, што лічыцца раёнам, які ахоплівае гэтая навучальная ўстанова, пры ўмове, што гэтая праца не супярэчыць мэтам гэтай установы. У галіне выкладання яна можа ахопліваць шырокае поле дзейнасці, уключаючы, у прыватнасці, пазаўстаноўную, пастаянную і дыстанцыйную адукацыю, якая забяспечваецца праз арганізацыю вечаровых заняткаў, кароткатэрміновых курсаў і семінараў, а таксама інстытутаў. У сферы даследчыцкай дзейнасці яна можа заключацца ў правядзенні экспертызы для дзяржаўнага, прыватнага і некамерцыйнага сектараў, прадастаўленні разнастайных кансультацый, удзеле ў правядзенні прыкладных даследаванняў і ва ўкараненні вынікаў даследаванняў;

(e) пад "вышэйшымі навучальнымі ўстановамі" маюцца на ўвазе універсітэты, іншыя адукацыйныя ўстановы, цэнтры і структуры вышэйшай адукацыі, а таксама даследчыцкія і культурныя цэнтры, звязаныя з кожнай з вышэйзгаданых устаноў, дзяржаўныя ці прыватныя, зацверджаныя ў якасці такіх ці праз прызнаныя акрэдытацыйныя сістэмы, ці кампетэнтнымі дзяржаўнымі органамі;

(f) пад "выкладчыцкімі кадрамі вышэйшых навучальных устаноў" маюцца на ўвазе ўсе асобы ў навучальных установах ці праграмах вышэйшай адукацыі, якія на працягу поўнага ці няпоўнага працоўнага дня займаюцца выкладаннем і/ці навуковай і/ці даследчыцкай дзейнасцю, і/ці тыя, хто прадастаўляе адукацыйныя паслугі навучэнцам ці грамадству ў цэлым.

### II. СФЕРА ПРЫМЯНЕННЯ

2. Гэтая Рэкамендацыя прымяняецца да ўсіх выкладчыцкіх кадраў вышэйшых навучальных устаноў.

### III. КІРУЮЧЫЯ ПРЫНЦЫПЫ

3. Для дасягнення глабальных задач, якія стаяць перад кожнай дзяржавай-членам і Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый у галіне забеспячэння міжнароднага міру, узаемапаразумення, супрацоўніцтва і ўстойлівага развіцця, патрабуюцца, у прыватнасці, выхаванне ў духу міру і культуры міру, як гэта вызначыла ЮНЕСКА, а таксама высокакваліфікаваныя і ўсебакова развітыя выпускнікі вышэйшых навучальных устаноў, здольныя служыць грамадству ў якасці адказных грамадзянаў і займацца плённай навуковай і прасунутай даследчыцкай дзейнасцю, г.зн. кантынгент адораных і кваліфікаваных выкладчыцкіх кадраў вышэйшых навучальных устаноў.

4. Вышэйшыя навучальныя ўстановы, асабліва універсітэты, з'яўляюцца супольнасцямі навукоўцаў, якія захоўваюць, распаўсюджваюць і свабодна выказваюць свае думкі па пытаннях традыцыйных ведаў і культуры і набываюць новыя веды, не будучы абмежаванымі ўсталяванымі дактрынамі. Набыццё новых ведаў і іх прымяненне з'яўляюцца галоўным прызначэннем такіх вышэйшых навучальных устаноў. У тых вышэйшых навучальных установах, дзе не ставіцца задача правядзення арыгінальных навуковых даследаванняў, выкладчыцкія кадры павінны падтрымліваць і павышаць узровень ведаў у галіне сваіх дысцыплін праз удзел у навуковай дзейнасці і павышэнні сваёй педагагічнай кваліфікацыі.

5. Развіццё вышэйшай адукацыі і навуковай і даследчыцкай дзейнасці шмат у чым залежыць ад інфраструктуры і рэсурсаў, як людскіх, так і матэрыяльных, а таксама ад кваліфікацыі і досведу выкладчыцкіх кадраў вышэйшых навучальных устаноў, гэтаксама як і ад іх чалавечых, педагагічных і тэхнічных якасцяў, якія грунтуюцца на акадэмічнай свабодзе, прафесійнай адказнасці, калегіяльнасці і інстытуцыйнай аўтаноміі.

6. Выкладанне ў сферы вышэйшай адукацыі з'яўляецца высокакваліфікаванай прафесіяй, формай служэння грамадству, якая патрабуе ад выкладчыцкіх кадраў вышэйшых навучальных устаноў глыбокіх ведаў і спецыяльных навыкаў, якія набываюцца і падтрымліваюцца ўпартым навучаннем і даследчыцкай дзейнасцю на працягу ўсяго жыцця; яно патрабуе таксама пачуцця асабістай адказнасці выкладчыка і ўстановы за адукацыю і дабрабыт навучэнца і грамадства ў цэлым і адпаведнасці высокім прафесійным патрабаванням, якія ставяцца перад навуковай і даследчыцкай дзейнасцю.

7. Умовы працы выкладчыцкіх кадраў вышэйшых навучальных устаноў павінны ў максімальнай ступені спрыяць эфектыўнаму выкладанню, навуковай і даследчыцкай дзейнасці і кансультацыйна-лектарскай працы і забяспечваць выкладчыцкім кадрам вышэйшых навучальных устаноў магчымасць выконваць прафесійныя задачы, якія стаяць перад імі.

8. Арганізацыі, якія прадстаўляюць выкладчыцкія кадры вышэйшых навучальных устаноў, неабходна разглядаць і прызнаваць у якасці сілы, здатнай зрабіць значны ўнёсак у развіццё адукацыі; у сувязі з гэтым іх варта прыцягваць разам з іншымі партнёрамі і зацікаўленымі бакамі да распрацоўкі палітыкі ў галіне вышэйшай адукацыі.

9. Варта паважаць разнастайнасць сістэмаў вышэйшай адукацыі ў кожнай дзяржавечлене, якія склаліся ў адпаведнасці з нацыянальнымі законамі і практыкай, а таксама з міжнароднымі стандартамі.

### IV. МЭТА І ПАЛІТЫКА Ў ГАЛІНЕ АДУКАЦЫІ

10. На ўсіх адпаведных стадыях нацыянальнага планавання ў цэлым і планавання ў сферы вышэйшай адукацыі ў прыватнасці дзяржавам-членам варта прымаць усе меры для таго, каб:

(a) вышэйшая адукацыя была накіравана на развіццё чалавека і прагрэс грамадства;

(b) вышэйшая адукацыя спрыяла дасягненню мэтаў адукацыі на працягу ўсяго жыцця і развіццю іншых формаў і ступеняў адукацыі;

(c) пры дзяржаўным фінансаванні вышэйшых навучальных устаноў яна разглядалася як форма дзяржаўных інвестыцый, якія падлягаюць строгаму кантролю з боку дзяржавы;

(d) фінансаванне вышэйшай адукацыі разглядалася як форма дзяржаўных інвестыцый, аддача ад якіх непазбежна носіць у значнай ступені доўгатэрміновы характар у залежнасці ад урадавых і дзяржаўных прыярытэтаў;

(e) грамадскасць была пастаянна паінфармавана аб абгрунтаванасці дзяржаўнага фінансавання.

11. Выкладчыцкія кадры вышэйшых навучальных устаноў павінны мець доступ да бібліятэк, дзе ёсць у наяўнасці сучасная літаратура, якая адлюстроўвае розныя бакі той ці іншай праблемы і не з'яўляецца прадметам цэнзуры ці іншых формаў умяшальніцтва ў інтэлектуальную дзейнасць. Яны таксама павінны мець не абмежаваны цэнзурай доступ да міжнародных камп'ютарных сетак, спадарожнікавых праграм і баз даных, неабходных для іх выкладчыцкай, навуковай ці даследчыцкай дзейнасці.

12. Варта спрыяць публікацыі і распаўсюджванню вынікаў навуковых даследаванняў, атрыманых выкладчыцкімі кадрамі вышэйшых навучальных устаноў, для набыцця імі той рэпутацыі, якую яны заслугоўваюць, а таксама для спрыяння развіццю навукі, тэхнікі, адукацыі і культуры ў цэлым. З гэтай мэтай варта прадастаўляць выкладчыцкім кадрам вышэйшых навучальных устаноў права бесперашкоднай публікацыі вынікаў сваіх навуковых даследаванняў і прац у кнігах, часопісах і базах даных паводле іх уласнага меркавання і пад сваім прозвішчам пры ўмове іх аўтарства ці сааўтарства вышэйзгаданых прац. Варта таксама забяспечваць адпаведную прававую абарону інтэлектуальнай уласнасці выкладчыцкіх кадраў вышэйшых навучальных устаноў, у прыватнасці абарону, прадугледжаную нацыянальным і міжнародным заканадаўствам у галіне аўтарскага права.

13. Варта актыўна спрыяць узаемнаабагачальнаму абмену ідэямі і інфармацыяй паміж выкладчыцкімі кадрамі вышэйшых навучальных устаноў ва ўсім свеце, што мае важнае значэнне для эфектыўнага развіцця вышэйшай адукацыі і даследчыцкай дзейнасці. Дзеля гэтага выкладчыцкія кадры вышэйшых навучальных устаноў павінны мець магчымасць на працягу ўсёй сваёй працоўнай дзейнасці ўдзельнічаць у міжнародных форумах, звязаных з вышэйшай адукацыяй ці даследчыцкай дзейнасцю, і рабіць паездкі за мяжу без абмежаванняў палітычнага характару, а таксама мець дзеля гэтага доступ да сеткі Інтэрнэт і да ўдзелу ў тэлеканферэнцыях.

14. Варта развіваць і заахвочваць праграмы, якія забяс-

*(Працяг на 4-й стар.)*

# Рэкамендацыі аб статусе выкладчыцкіх кадраў вышэйшых навучальных установаў

*(Працяг. Пачатак на 3-й стар.)*

печваюць максімальна шырокі абмен выкладчыцкімі кадрамі вышэйшых навучальных установаў паміж установамі як у нацыянальным, так і ў міжнародным маштабе, уключаючы арганізацыю сімпозіумаў, семінараў і сумесных праектаў, а таксама абмен інфармацыяй у галіне адукацыі і навукі. Варта спрыяць пашырэнню сувязяў і непасрэдных кантактаў паміж універсітэтамі, даследчымі ўстановамі і навуковымі супрацоўнікамі. Неабходна таксама спрашчаць выкладчыцкім кадрам вышэйшых навучальных установаў доступ да адкрытых інфармацыйных матэрыялаў у дзяржаўных архівах, бібліятэках, даследчых установах і аналагічных арганізацыях.

15. Дзяржавам-членам і вышэйшым навучальным установам варта, тым не менш, улічваць масавую эміграцыю выкладчыцкіх кадраў вышэйшых навучальных установаў з краінаў, якія развіваюцца, асабліва з найменш развітых краінаў. У сувязі з гэтым ім варта спрыяць праграмам дапамогі краінам, якія развіваюцца, дзеля забеспячэння адпаведных магчымасцяў для акадэмічнай дзейнасці, уключаючы стварэнне задавальняючых умоваў працы для выкладчыцкіх кадраў вышэйшых навучальных установаў у гэтых краінах, каб гэтую эміграцыю можна было стрымаць, а потым і павярнуць назад.

16. У адпаведнасці з духам Рэкамендацыі ЮНЕСКА аб прызнанні навучальных курсаў і пасведчанняў аб вышэйшай адукацыі 1993 г. варта праводзіць бесстаронную, справядлівую і разумную нацыянальную палітыку і практыку ў дачыненні прызнання ступеняў і дыпломаў іншых дзяржаваў, якія даюць права займацца прафесійнай дзейнасцю ў сферы вышэйшай адукацыі.

## V. ПРАВЫ, АБАВЯЗКІ І АДКАЗНАСЦЬ ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОВАЎ

*А. Аўтаномія вышэйшых навучальных установаў*

17. Каб належным чынам скарыстацца акадэмічнай свабодай і выконваць пералічаныя ніжэй абавязкі, вышэйшыя навучальныя ўстановы павінны мець аўтаномію. Пад аўтаноміяй маецца на ўвазе такая ступень самакіравання, якая неабходна вышэйшым навучальным установам для эфектыўнага прыняцця рашэнняў у дачыненні сваёй навучальнай працы, нормаў кіравання і адпаведнай дзейнасці і якая сумяшчаецца з дзяржаўнымі сістэмамі падсправаздачнасці, асабліва ў тым, што датычыць дзяржаўнага фінансавання, а таксама з павагай акадэмічнай свабоды і правоў чалавека. У той жа час характар аўтаноміі вышэйшых навучальных установаў можа адрозніваецца ў залежнасці ад тыпу ўстановы.

18. Аўтаномія з'яўляецца інстытуцыйнай формай акадэмічнай свабоды і неабходнай папярэдняй умовай для гарантавання належнага выканання абавязкаў, ускладзеных на выкладчыцкія кадры і ўстановы сістэмы вышэйшай адукацыі.

19. Дзяржавы-члены абавязаны абараняць вышэйшыя навучальныя ўстановы ад усялякіх замахаў на іх аўтаномію, адкуль бы яны ні сыходзілі.

20. Аўтаномія не мусіць выкарыстоўвацца вышэйшымі навучальнымі ўстановамі ў якасці падставы для абмежавання правоў выкладчыцкіх кадраў вышэйшых навучальных установаў, прадугледжаных у гэтай Рэкамендацыі або ў іншых міжнародных нарматыўных актах, пералічаных у Дадатку.

21. Самакіраванне, калегіяльнасць і належнае акадэмічнае кіраўніцтва вышэйшымі навучальнымі ўстановамі з'яўляюцца найважнейшымі складовымі часткамі іх сапраўднай аўтаноміі.

*В. Падсправаздачнасць вышэйшых навучальных установаў*

22. Улічваючы значныя фінансавыя інвестыцыі, дзяржавы-члены і вышэйшыя навучальныя ўстановы павінны забяспечваць належную збалансаванасць паміж узроўнем аўтаноміі вышэйшых навучальных установаў і іх сістэмамі падсправаздачнасці. Дзеля забеспячэння падсправаздачнасці вышэйшыя навучальныя ўстановы павінны імкнуцца да таго, каб кіраванне імі насіла адкрыты характар. Яны павінны быць падсправаздачнымі ў наступных пытаннях:

(a) эфектыўнае інфармаванне грамадскасці аб характары сваёй адукацыйнай місіі;

(b) забеспячэнне якасці і высокіх стандартаў пры ажыццяўленні сваіх адукацыйных, навуковых і даследчых функцый і выкананне абавязку абараняць і гарантаваць справядлівасць сваёй выкладчыцкай, навуковай і даследчай дзейнасці ад умяшальніцтва, несумяшчальнага з акадэмічнымі задачамі, якія стаяць перад імі;

(c) эфектыўная падтрымка акадэмічнай свабоды і асноўных правоў чалавека;

(d) забеспячэнне ў межах наяўных сродкаў высокай якасці адукацыі для як мага большай колькасці асобаў, якія адпавядаюць акадэмічным патрабаванням;

(e) забеспячэнне магчымасцяў для адукацыі на працягу ўсяго жыцця з улікам задач навучальнай установы і прадастаўленых сродкаў;

(f) забеспячэнне бесстаронных, справядлівых і недыскрымінацыйных адносінаў са студэнтамі;

(g) правядзенне палітыкі і прыняцце мераў, накіраваных на забеспячэнне справядлівых дачыненняў з жанчынамі і меншасцямі і ўстараненне сексуальных дамагальніцтваў і расавага пераследу;

(h) забеспячэнне таго, каб навучальнай працы або даследчыцкай дзейнасці выкладчыкаў вышэйшых навучальных установаў не перашкаджалі гвалт, запалохванне ці пераслед;

(i) сумленны і адкрыты ўлік;

(j) эфектыўнае выкарыстанне сродкаў;

(k) складанне ў рамках калегіяльнага працэсу і/ці шляхам перамоваў з арганізацыямі, якія прадстаўляюць выкладчыкаў вышэйшых навучальных установаў, у адпаведнасці з прынцыпамі акадэмічнай свабоды і свабоды слова, дэкларацый ці кодэксаў па пытаннях этыкі, якімі яны будуць кіравацца ў сваёй выкладчыцкай, навуковай і даследчыцкай дзейнасці і кансультацыйна-лектарскай працы;

(l) спрыянне ажыццяўленню эканамічных, сацыяльных, культурных і палітычных правоў і прадухіленне выкарыстання ведаў, навукі і тэхнікі на шкоду гэтым правам ці для мэтаў, якія супярэчаць агульнапрынятым нормам акадэмічнай этыкі, правам чалавека і справе міру;

(m) забеспячэнне дзейнасці па вырашэнні сучасных праблемаў, якія стаяць перад грамадствам: з гэтай мэтай іх навучальныя праграмы, а таксама мерапрыемствы, якія яны праводзяць, павінны, па меры магчымасці, адпавядаць цяперашнім і будучым патрэбам мясцовай супольнасці і грамадства ў цэлым і адыгрываць важную ролю ў пашырэнні магчымасцяў выпускнікоў у сферы працаўладкавання;

(n) заахвочванне, па меры неабходнасці і магчымасці, міжнароднага акадэмічнага супрацоўніцтва, не абмежаванага нацыянальнымі, рэгіянальнымі, палітычнымі, этнічнымі і іншымі рамкамі, спрыянне прадухіленню навуковай і тэхнічнай эксплуатацыі адной дзяржавы другой і развіццё на раўнапраўнай аснове партнёрскіх сувязяў паміж усімі акадэмічнымі супольнасцямі свету ў набыцці і захаванні культурнай спадчыны;

(o) забеспячэнне абнаўлення фондаў бібліятэк і бесцэнзурнага доступу да сучасных навучальна-метадычных, навукова-даследчых і інфармацыйных рэсурсаў, неабходных выкладчыкам вышэйшых навучальных установаў ці студэнтам у іх выкладчыцкай, навуковай ці даследчыцкай дзейнасці;

(p) забеспячэнне сродкамі і абсталяваннем, неабходнымі для выканання задач, якія стаяць перад навучальнай установай, і іх належная эксплуатацыя;

(q) забеспячэнне таго, каб удзел у закрытых даследаваннях не супярэчыў ні навучальным мэтам і задачам навучальных установаў, ні агульным мэтам умацавання міру, захавання правоў чалавека, устойлівага развіцця і аховы навакольнага асяроддзя.

23. Сістэмы падсправаздачнасці навучальных установаў павінны быць абгрунтаваныя на навуковай метадалогіі і быць дакладнымі, рэалістычнымі, рэнтабельнымі і простымі. Іх функцыянаванне павінна на практыцы насіць бесстаронны, справядлівы і добрасумленны характар. Як метадалогія, так і вынікі павінны быць адкрытымі.

24. Вышэйшым навучальным установам варта індывідуальна або калектыўна распрацоўваць і прымяняць адпаведныя сістэмы падсправаздачнасці, уключаючы механізмы, якія забяспечваюць яе якасць, для дасягнення вышэйзгаданых мэтаў, не наносячы пры гэтым шкоды аўтаноміі ці акадэмічнай свабодзе гэтых установаў. Арганізацыям, якія прадстаўляюць выкладчыцкія кадры вышэйшых навучальных установаў, неабходна, па меры магчымасці, удзельнічаць у планаванні такіх сістэм. У выпадку стварэння структураў падсправаздачнасці пад эгідай дзяржавы метады іх дзейнасці варта, па магчымасці, абмяркоўваць з адпаведнымі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі і з наяўнымі арганізацыямі, якія прадстаўляюць выкладчыцкія кадры вышэйшых навучальных установаў.

## VI. ПРАВЫ І СВАБОДЫ ВЫКЛАДЧЫЦКІХ КАДРАЎ ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОВАЎ

*А. Індывідуальныя правы і свабоды: грамадзянскія правы, акадэмічная свабода, правы на публікацыю і міжнародны абмен інфармацыяй*

25. Доступ да прафесійнай дзейнасці ў сферы вышэйшай адукацыі павінен грунтавацца толькі на адпаведнай акадэмічнай кваліфікацыі, кампетэнтнасці і досведзе, а таксама быць роўным для ўсіх членаў грамадства без усялякай дыскрымінацыі.

26. Выкладчыцкія кадры вышэйшых навучальных установаў, як і іншыя групы і індывідуумы, павінны карыстацца грамадзянскімі, сацыяльнымі і культурнымі правамі, прызнанымі на міжнародным узроўні ў дачыненні да ўсіх грамадзянаў. Таму ўсе выкладчыцкія кадры вышэйшых навучальных установаў павінны карыстацца правам на свабоду думкі, сумлення, рэлігіі, слова, сходаў і асацыяцыяў, а таксама правам на свабоду і бяспеку асобы і свабоду перамяшчэння. Як грамадзяне яны не павінны сутыкацца ні з якімі перашкодамі ці абмежаваннямі ў ажыццяўленні сваіх грамадзянскіх правоў, уключаючы права спрыяння сацыяльным зменам шляхам свабоднага выказвання свайго меркавання пра дзяржаўную палітыку і палітыку, якая закранае вышэйшую адукацыю. Яны не павінны зазнаваць аніякія пакаранні ў выніку толькі ажыццяўлення такіх правоў. Выкладчыцкія кадры вышэйшых навучальных установаў не павінны быць адвольна арыштаваныя ці затрыманыя, зазнаваць катаванні ці жорсткае, бесчалавечнае ці прыніжальнае для чалавечай годнасці абыходжанне. У выпадку грубага парушэння правоў выкладчыцкіх кадраў вышэйшых навучальных установаў яны павінны мець права на падачу апеляцыі ў адпаведныя нацыянальныя, рэгіянальныя ці міжнародныя органы, такія як установы сістэмы Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, а арганізацыі, якія прадстаўляюць выкладчыцкія кадры вышэйшых навучальных установаў, павінны ў такіх выпадках аказваць ім усебаковую дапамогу.

27. Варта забяспечваць захаванне вышэйзгаданых міжнародных нормаў у інтарэсах вышэйшай адукацыі на міжнародным і нацыянальным узроўнях. У сувязі з гэтым павінен старанна захоўвацца прынцып акадэмічнай свабоды. Выкладчыцкія кадры вышэйшых навучальных установаў маюць права на акадэмічную свабоду, г.зн. не абмежаванае ніякай усталяванай дактрынай права на свабоду выкладання і абмеркавання, свабоду правядзення даследаванняў, распаўсюджвання і публікацыі іх вынікаў, свабоднае выказванне сваіх думак наконт установы ці сістэмы, у якіх яны працуюць, свабоду ад інстытуцыйнай цэнзуры і свабоду ўдзелу ў прафесійных або прадстаўнічых акадэмічных органах. Усе выкладчыцкія кадры вышэйшых навучальных установаў павінны мець права выконваць свае абавязкі без усялякай дыскрымінацыі, не баючыся ніякіх рэпрэсіўных дзеянняў з боку дзяржавы ці з якога іншага боку. Выкладчыцкія кадры вышэйшых навучальных установаў могуць у поўнай меры кіравацца гэтым прынцыпам у тым выпадку, калі асяроддзе, у якім яны працуюць, спрыяе гэтаму, што вымагае дэмакратыі; адсюль вынікае, што развіццё дэмакратычнай супольнасці з'яўляецца агульнай задачай.

28. Выкладчыцкія кадры вышэйшых навучальных установаў маюць права на выкладанне без усялякага ўмяшальніцтва пры ўмове захавання прызнаных прафесійных прынцыпаў, уключаючы прафесійную адказнасць і інтэлектуальную патрабавальнасць у дачыненні да нормаў і метадаў выкладання. Недапушчальна патрабаваць ад выкладчыцкіх кадраў вышэйшых навучальных установаў праводзіць навучанне насуперак іх ведам і сумленню ці прымушаць іх выкарыстоўваць навучальныя праграмы і метады супярэчныя нацыянальным і міжнародным нормам, датычным правоў чалавека. Выкладчыцкія кадры вышэйшых навучальных установаў мусяць адыгрываць вядучую ролю ў распрацоўцы навучальных праграмаў і планаў.

29. Выкладчыцкія кадры вышэйшых навучальных установаў маюць права на правядзенне навуковых даследаванняў без усялякіх забаронаў альбо ўмяшальніцтва, кіруючыся сваёй прафесійнай адказнасцю і пры ўмове захавання прызнаных на нацыянальным і міжнародным узроўнях прафесійных прынцыпаў інтэлектуальнай патрабавальнасці, пошуку навуковай ісціны і даследчыцкай этыкі. Яны таксама павінны мець права на свабодную перадачу іншым асобам і на публікацыю вынікаў даследаванняў, аўтарамі ці сааўтарамі якіх яны з'яўляюцца, у адпаведнасці з пунктам 12 гэтай Рэкамендацыі.

30. Выкладчыцкія кадры вышэйшых навучальных установаў маюць права займацца прафесійнай дзейнасцю па-за сваёй працай, у прыватнасці дзейнасцю, якая павышае ўзровень іх прафесійных ведаў і навыкаў ці дазваляе прымяняць іх веды для вырашэння праблем, якія стаяць перад грамадствам, пры ўмове, што такая дзейнасць не супярэчыць іх галоўным абавязкам перад установай, якая з'яўляецца іх асноўным працадаўцам, у адпаведнасці з палітыкай і правіламі гэтай установы і нацыянальным заканадаўствам і практыкай там, дзе яны існуюць.

*В. Самакіраванне і калегіяльнасць*

31. Выкладчыцкія кадры вышэйшых навучальных установаў павінны мець права і магчымасць без усялякай дыскрымінацыі ў адпаведнасці са сваімі здольнасцямі браць удзел у працы кіраўнічых органаў і крытыкаваць функцыянаванне вышэйшых навучальных установаў уключна з тымі, дзе яны працуюць, адначасова паважаючы правы іншых групаў акадэмічнай супольнасці на ўдзел у такой дзейнасці; яны павінны таксама мець права выбіраць большасць прадстаўнікоў у акадэмічныя органы ў рамках вышэйшай навучальнай установы.

32. Прынцыпы калегіяльнасці ўключаюць акадэмічную свабоду, сумесную адказнасць, палітыку ўдзелу ўсіх зацікаўленых асобаў ва ўнутраных структурах, якія забяспечваюць прыняцце і выкананне рашэнняў, а таксама развіццё кансультацыйных механізмаў. Працэс калегіяльнага прыняцця рашэнняў павінен ахопліваць кіраванне і вызначэнне палітыкі ў галіне адукацыі, навучальных праграмаў і планаў, даследчыцкай дзейнасці, кансультацыйна-лектарскай працы, размеркавання сродкаў і іншых адпаведных мерапрыемстваў, накіраваных на павышэнне ўзроўню якасці акадэмічнай дзейнасці на карысць усяго грамадства.

*(Працяг будзе.)*

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года
Заснавальнік газеты – БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

5снежня 2002 года
Падпісана да друку 4.12.2002
Ум. друк. арк. 1
Зак. 1406. Тыраж 1000 экз.

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 149 ад 28 чэрвеня 1996 года.

Распрацоўшчык лагатыпа і дызайну газеты У.У. Васюк

Газета надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ" 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Т.М. КАЗАК

Адрас рэдакцыі: 220050, Мінск, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 209-53-45, e-mail: Gazeta@bsu.by